## 17 лютага 2023 г. - 75 гадоў з дня нараджэння ІВАНА АЛЯКСЕЕВІЧА КРУСЯ (1948), мастака тэатра, дэкаратара, дызайнера



**Іван Аляксеевіч Крусь** нарадзіўся 17 лютага 1948 года ў в. Лягаты Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці ў сям'і сялян. Вучыўся ў Стрыгаўскай сярэдняй школе. Пасля заканчэння васьмі класаў у 1963 годзе паступіў у Мінскае мастацкае вучылішча імя А. К. Глебава (цяпер – Мінскі дзяржаўны мастацкі каледж імя А. К. Глебава).

Служыў у Савецкай арміі, давялося служыць на тэрыторыі Чэхаславакіі. Пасля дэмабілізацыі прыехаў у г. Брэст. Працаваў у розных рэкламных прадпрыемствах горада. З 1970 па 1976 год працаваў мастаком у вытворча-мастацкім аб'яднанні «Белторгреклама», займаўся распрацоўкай светлавой рэкламы. Занімаў пасаду старшыні прафсаюзнай арганізацыі. Потым нядоўгі час быў метадыстам па выяўленчаму мастацтву ў Брэсцкім абласным Доме народнай творчасці (цяпер - абласны грамадска-культурны цэнтр), быў абраны старшынёй прафсаюзнай арганізацыі. Некаторы час працаваў метадыстам па выяўленчаму мастацтву ў Брэсцкім абласным Доме народнай творчасці. У 1976 годзе распрацаваў праграму 10-месячных курсаў мастакоў-афарміцеляў, выкладаў на гэтых курсах да 1982 года.

У 1977–1989 гадах Іван Крусь служыў галоўным мастаком у Брэсцкім абласным тэатры лялек. Працаваў з галоўнымі рэжысёрамі А. А. Шкілёнкам (да 1981 г.), В. С. Казловай (1983–1986), С. Ф. Юркевічам (1986–1989). Дапамагаў фарміраваць творчы рэпертуар. Непасрэдна займаўся афармленнем фае тэатра і яго тэрыторыі, афішамі.

Афармляў спектаклі «Заячья школа» (1977), «Иван, крестьянский сын» (1978), «Поросёнок Чок» (1979), «Белоснежка и семь гномов» (1979), «Тайна трёх “не”» (1980), «Аленький цветочек» (1981), «Ещё раз о Красной Шапочке» (1981), «Людвиг и Тута (1982), «Говорящий кувшин» (1982), «Бука» (1983), «Золотое зёрнышко» (1983), «Василиса Прекрасная» (1984), «Мальчик из легенды» (1984),

«Кто в сапогах» (1986), пастаноўкі для дарослых «Ловите миг удачи!» (1978), «Иностранец в Риме» (1985).

З 1989 года І. А. Крусь працаваў дэкаратарам, дызайнерам у рэкламным камбінаце аблспажыўсаюза. Адначасова пісаў афішы ў кінатэатры «Маяк».

Да 2015 года быў аформлены як індывідуальны прадпрымальнік. Выканаў дызайн інтэр'ера прадуктовага магазіна «Купеческий» (вул. Пушкінская, 56). Рапрацаваў лагатып Брэсцкага лікёра-гарэлачнага завода (2000). І гэтыя гады самастойнай творчасці лічыць аднымі з лепшых у сваёй працоўнай дзейнасці.

Іван Аляксеевіч займаецца станковым жывапісам і графікай. Прымаў удзел у абласных, усесаюзных і міжнародных выставах. Найчасцей працуе ў тэхніцы пастэлі, любімы жанр – нацюрморт. Эксперыментуе з фарбамі, з пастэллю. Любіць маляваць каляровымі алоўкамі, менавіта гэты матэрыял больш адпавядае яго стану душы. У яго атрымліваюцца выдатныя нацюрморты з кветкамі.

Іван Аляксеевіч не пакідае свайго захаплення і сёння, а натхненне не пакідае яго.

Жыве ў Брэсце.

Матэрыял падрыхтаваны ў 2023 г. Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкай. Курачук Святлана Дзмітрыеўна, бібліёграф І кат. аддзела абслугоўвання і інфармацыі

## Аб жыцці і дзейнасці І. А. Круся

**Валасюк, Л.** Зямляк з Лягатаў / Лявон Валасюк // Непрыдуманыя партрэты : мастакі і літаратары, народныя майстры і дойліды Берасцейшчыны / Лявон Валасюк. – Брэст, 2014. – С. 122 : фат., 268.

**Каладзінскі, М. А.** Брэсцкі абласны тэатр лялек **/** М. А. Каладзінскі, С. Ф. Юркевіч // Тэатральная Беларусь : энцыклапедыя : у 2 т. - Мінск. 2002. - Т. 1. - С. 166-169.

І. А. Крусь – галоўны мастак у 1977–1989 гг.

**Каладзінскі, М. А.** Брэсцкі абласны тэатр лялек / М. А. Каладзінскі // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5 т. - Мінск, 1984. - Т. 1. - С. 494.

Узгадваецца І. Крусь.

**Александр** Алонцев. Акварель : [альбом-каталог / оформл.: И. Крусь]. – Брест, 2010.

**Каталог** выставки работ самодеятельных художников и мастеров декоративно-прикладного искусства : 2-й тур Всесоюзного фестиваля самодеятельного художественного творчества трудящихся / Брестский обл. дом народного творчества ; сост. и оформл. И. А. Крусь. – Брест, 1976. – 8 с.

**17 лютага** - 75 гадоў з дня нараджэння Івана Аляксеевіча Круся (1948, Кобрынскі р-н), мастака тэатра // Каляндар знамянальных і памятных дат на 2023 год / Брэсцкая абласная бібліятэка імя М. Горкага, Аддзел бібліятэказнаўства ; [складальнік А. В. Пастыка ; рэдактары: Л. К. Кароль, А. С. Кузьміна]. – Брэст, 2022. – С. 15.

**75 гадоў з дня нараджэння І. А. Круся (1948)** // Зводны Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2021-2025 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. – С. 88.

**Каримова, И**. Где живет сказка? / И. Каримова // Заря. - 1985. - 16 августа.

О главном художнике Брестского областного театра кукол И. А. Крусе.

**Крусь, И.** Слово народных умельцев / И. Крусь // Заря. - 1975. - 20 марта.

Об областной выставке работ самодеятельных художников и мастеров народного творчества.

**Крусь Іван Аляксеевіч** // Беларусь у падзеях і асобах [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: https://bis.nlb.by/en/documents/154854/ - Дата доступа: 07.02.2023.

Кобрынскі раён
Лягаты
Брэст
Брэсцкі тэатр лялек
Крусь Іван Аляксеевіч
Мастакі